| МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ | МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ |
|---|---|
| ПАСТАНОВА | ПОСТАНОВЛЕНИЕ |

__________ № __________

г. Мінск г. Минск

Аб змяненні пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2023 г. № 1

На падставе пункта 6 артыкула 97, артыкула 98 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзаца трэцяга падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2025 г. № 04-01-02/8, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджаны пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2023 г. № 1, наступныя змяненні:

1.1. у раздзеле 1 “Матэрыяльныя нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь”:

1.1.1. у падраздзеле “г. Брэст” выключыць пазіцыю:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “113Г000742 | Будынак | першая палова XX стагоддзя | г. Брэст, 1 Мінскі завулак, 12 | 3 | рашэнне Рады ад 20.06.2012 № 194 | пастанова Савета Міністраў ад 02.08.2016 № 607”; |

1.1.2. у падраздзеле “г. Мінск” пасля пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “713Ж000384 | мемарыяльная кампазіцыя «Звон Нагасакі» | 2000 год | | 3 | рашэнні Рады ад 18.01.2002 № 70, 29.09.2010 № 173 | пастановы Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578, 12.09.2011 № 1214” |

дапоўніць пазіцыяй:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “712Ж000385 | Дэкаратыўныя керамічныя | 1979 год | праспект | 2 | рашэнне Рады ад | пастанова Міністэрства |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | пано гасцініцы «Планета» | | Пераможцаў, 31/1 | | 12.12.2025 № 04-01-02/8 | культуры ад 31.12.2025 № 154”; |

1.2. у падраздзеле “Горацкі раён” раздзелу 3 “Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь” пасля пазіцыі:

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “53АК000072 | Спеўная традцыя выканання хрэсьбінных і вясельных песень | - | в. Паршына | А | рашэнне Рады ад 26.11.2011 № 186 | пастанова Міністэрства культуры ад 16.03.2012 № 236” |

дапоўніць пазіцыяй:

“Глускі раён”

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| “53АК000185 | Традыцыйная тэхналогія бандарных вырабаў | - | Глускі раён | А | рашэнне Рады ад 12.12.2025 № 04-01-02/8 | пастанова Міністэрства культуры ад 31.12.2025 № 154”. |

2. Гэта пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Міністр Р.І.Чарнецкі